## ПОЛІТЫЧНАЯ СПРАВАЗДАЧА ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТУ КП(б)Б.

### Даклад сакратара ЦК КП(б)Б тав. К. В. Гея.

Таварышы, даклад тав. Мануільскага зьмяшчаў у сабе падрабязны агляд міжнароднага становішча. Я дазволю сабе таму спыніцца толькі на тэй частцы работы ў справаздачным дакладзе ЦК КП(б)Б, якая выцякала непасрэдна з фактаў абвастрэньня клясавага змаганьня і набліжэньня небясьпекі ўзброенага нападу імпэрыялістых на Савецкі Саюз.

Мы жывем у БССР на рубяжы з капіталістычным Захадам і пастаянныя клопаты аб узмацненьні абараназдольнасьці краю прадстаўляюць сабой адну з вельмі важных галін дзейнасьці ЦК.

Надзвычайна ўважліва сачыў Цэнтральны Камітэт за работай Чырвонай арміі, усямер-

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

на дапамагаючы ўзмацненьню яе баявой здольнасьці і падрыхтаванасьці да абароны краю. Апрача таго, ЦК праводзіў работу па ваенізацыі насельніцтва. Пастаяннай нашай работай было і зьяўляецца растлумачэньне міжнароднага становішча, растлумачэньне небясьпекі вайны, падрыхтоўка рабочых і сялян да магчымага нападу імпэрыялістых на наш Савецкі Саюз. Мы рабілі ўсё, што было ў нашых сілах для абярненьня БССР у сапраўдны моцны форпост Саюзу ССР на рубяжы з капіталістычным Захадам.

## ГАСПАДАРЧАЕ БУДАЎНІЦТВА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ.

### Стан прамысловасьці.

Характарыстыку посьпехаў гаспадарчага будаўніцтва БССР я пачну з прамысловасьці. Прамысловасьць Савецкай Беларусі разьвіваецца больш быстрым тэмпам, чым прамысловасьць якой-небудзь іншай Саюзнай рэспублікі.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

За 1928-29 г. рост продукцыі нашай прамысловасьці склаў 41 проц. у той час, як рост агуловай продукцыі цэнзавай прамысловасьці ў Туркмэнскай Саюзнай Рэспублікі даў 39 проц., Узбэкскай—36 проц., Закаўкаскай—25 проц., РСФСР—24 проц. і Украінскай—16 проц. Сярэдні процант росту продукцыі прамысловасьці па ўсім Саюзе, які раўняецца 23 проц., перавышаны намі амаль у два разы. Тэмпы нашага росту перавышаюць у пяць разоў тэмпы росту прамысловасьці ў перадавых капіталістычных краінах—у лепшыя гады іх прамысловага росквіту. Ні капіталістычная Амэрыка, ні капіталістычная Нямеччына не давалі ў лепшыя гады свайго прамысловага росквіту больш 8 проц. прыросту продукцыі прамысловасьці.

У прыведзеных намі лічбах разьвіцьцё прамысловасьці Савецкага Саюзу знаходзіць сваё адлюстраваньне і выкананьне агульнага заданьня—дагнаць і выпередзіць капіталістычныя краіны, знаходзіць сваё адлюстраваньне і практычнае ажыцьцяўленьне нацыянальнай палітыкі комуністычнай

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

партыі. У бурных тэмпах росту прамысловасьці Беларусі знаходзіць выразнае адлюстраваньне палітыка нашай партыі, накіраваная на зьнішчэньне матэрыяльнай няроўнасьці, створанай царскім урадам, на зьнішчэньне матэрыяльнай адсталасьці.

У першым паўгодзьдзі бягучага году мы ня толькі ўтрымалі высокія тэмпы разьвіцьця прамысловасьці, дасягнутыя намі летась, але і значна ўзмацняем гэтыя тэмпы. Прамысловая продукцыя першага паўгодзьдзя бягучага году ўзрасла на 72 проц. у параўнаньні з першым паўгодзьдзем мінулага году, складаючы за паўгодзьдзе 129 млн. р. супроць 173 млн. руб. за ўвесь папярэдні год.

Адпаведна гэтаму быстраму росту прамысловасьці мацнее і павялічваецца рабочая кляса Савецкай Беларусі. На 1 кастрычніка 1928 г. мы мелі 34 тысячы рабочых, праз год гэта колькасьць павялічылася да 43 тысяч, а на 1 красавіка 1930 г. ужо налічваецца 52 тысячы рабочых. Гэты рост рабочых, рост пролетарыяту ў Савецкай Беларусі, дазваляе нам па-новаму ставіць цэлы рад пытаньняў,

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

ў тым ліку і важнейшае пытаньне аб выхаваньні новых кадраў у партыі.

Быстрым тэмпам разгортваецца капітальнае будаўніцтва. Летась затраты на капітальнае будаўніцтва складалі 21 млн. руб., у цяперашнім годзе програма будаўніцтва разгортваецца на суму 52 млн. руб. Нашы мерапрыемствы на будучы год мы падрыхтоўваем і распрацоўваем такім чынам, каб ня зьнізіць тэмпаў прамысловага разьвіцьця.

Праўда, неабходна адзначыць, што ў абсягу капітальнага будаўніцтва мы сустрэліся з пэўнымі затрудненьнямі.

Першае затрудненьне—лімітам цяперашняга году, які акрэсьліць разьмер капітальных укладаньняў, зьявіцца, відавочна, пытаньне аб забесьпячэньні будаўніцтва жалезам. Становішча з жалезам усё яшчэ застаецца надзвычай напружаным. Другое затрудненьне, якое ўжо становіцца ясна адчувальным і ўплываючым на зьніжэньне быстрых тэмпаў капітальнага будаўніцтва—гэта пытаньне абсталяваньня прадпрыемстваў. Спроба эканомічнай блёкады Савецкага Саюзу стварыла напружанае становішча з імпартам. Увоз

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

машын з заграніцы затрудняецца і скарачаецца; мы маем ужо выпадкі, калі закончаны, або амаль закончаны фабрычны корпус не забясьпечаны адпаведным абсталяваньнем.

У такім становішчы знаходзіцца, напрыклад, віцебская панчошна-трыкатажная фабрыка.

Гэтыя дзьве акалічнасьці—недахват жалеза і затрудненьні з імпортным абсталяваньнем—будуць націскаць на програму будучага году ў бок яе зьніжэньня. Праўда, Савецкі Саюз разгортвае зараз машынабудаўніцтва ўнутры краю і Цэнтральным Камітэтам нашай партыі ўхвален рад пастаноў, якія ў значнай ступені павялічваюць програму машынабудаўнічых заводаў.

Вельмі паказальным для росту нашай прамысловасьці зьяўляюцца, таксама лічбы, якія характарызуюць рост электрыфікацыі краю.

У 1928 г. мы мелі ў Савецкай Беларусі ўсяго 14 тысяч кілёват установак на электрастанцыях, у 1929 г.—17 тысяч, а ў 1930 г., пасьля пуску Асінаўскай раённай станцыі

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

імя тав. Сталіна, мы будзем мецъ 33 тысячы кілёват установкі. Мы намячаем далейшую пабудову буйных раённых электрастанцый з тым, каб падвесьці новую тэхнічную базу пад прамысловасьць БССР.

Такім чынам Цэнтральны Камітэт КП(б)Б можа далажыць XIII Усебеларускаму партыйнаму зьезду, што пастаўленая партыяй задача індустрыялізацыі БССР, задача павялічэньня адноснай вагі прамысловасьці ў агульнай народнай гаспадарцы БССР выконвалася Цэнтральным Камітэтам са значным посьпехам.

Ня трэба, вядома, пераацэньваць гэтых посьпехаў, мы яшчэ не абярнуліся ў край заводзкіх труб, але пры энэргічным падтрыманьні і дапамозе Савецкага Саюзу мы ідзем даволі быстрымі крокамі па шляху індустрыялізацыі краю.

Далейшае разгортваньне прамысловасьці павінна будзе ў асноўным базавацца на скарыстаньні мясцовай сыравіны. Лес, лён,

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

торф, будаўнічыя матэрыялы—вось тыя асноўныя багацьці БССР, скарыстаньне якіх павінна быць пастаўлена ў парадак дня. Мы не адмаўляемся ад пабудовы прадпрыемстваў, якія перапрацоўваюць увозную сыравіну, але асноўны ўпор павінен быць на прадпрыемствы, якія працуюць на мясцовай сыравіне.

Буйнейшае значэньне набывае вырашэньне тарфяной проблемы. У Беларусі ёсьць багацейшыя паклады торфу, які зьяўляецца дасканалым апалам. Як вядома, прамысловасьць адчувае патрэбу для свайго разьвіцьця ў энэргетычнай базе. Гэту базу ва ўмовах БССР мы маем у пакладах торфу, які можна абярнуць на вытворчасьць электраэнэргіі на буйных раённых электрастанцыях. Торф можа зьявіцца сыравінай для цэлага раду вытокных працэсаў хімічнай прамысловасьці і раду іншых галін прамысловасьці аж да вырабу з торфу тканін.

У працэсе будаўніцтва зараз знаходзіцца рад буйных прадпрыемстваў, пабудова якіх заканчваецца ў бліжэйшы час.

З недахопаў работы прамысловасьці за мі-

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

нулы час з асаблівай сілай трэба высунуць два асноўныя моманты.

Першы момант—гэта пытаньне зьніжэньня сабекошту і другі момант—пытаньні якасьці прамысловай продукцыі.

Зьніжэньне сабекошту летась было намечана на 7 проц., выканана-ж гэтае заданьне толькі на 4,5 проц. У цяперашнім годзе па програме намечана зьніжэньне сабекошту на 11 проц., а выканана за першае паўгодзьдзе толькі 7 проц.

Наўрад ці трэба шмат гаварыць аб якасьці нашае продукцыі і яе выключна нізкім узроўні. Змаганьне за павышэньне якасных паказальнікаў выпусканай продукцыі павінна зьявіцца складанай важнейшай часткай нашага агульнага змаганьня за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну.

Буйным тормазам у разьвіцьці работы прамысловасьці зьяўляецца таксама і тая акалічнасьць, што дырэктыва партыі аб правядзеньні адзінаначальля да гэтага часу ў пераважнай частцы прадпрыемстваў не праведзена ў жыцьцё. Работа гаспадарчых, партыйных і прафсаюзных арганізацый на прад-

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

прыемствах вядзецца, як і раней, бяз сыстэмы, маса сіл затрачваецца на непатрэбны паралелізм, які толькі параджае шмат конфліктаў і трэньняў.

Гэта нявыразнасьць у рабоце, адсутнасьць неабходнай падрыхтоўкі, адсутнасьць неабходнай прадуманасьці ў кіраўніцтве, зьвязаная з тым, што адзінаначальле не праведзена,—усе гэтыя адмоўныя бакі праявіліся ў справе пераводу нашай прамысловасьці на 7-гадзінны рабочы дзень і на бесьперапынны рабочы тыдзень.

Перавод на бесьперапынны рабочы тыдзень і ўвядзеньне 7-гадзіннага рабочага дня спрыяючым чынам адбіліся на рабоце прадпрыемстваў, павялічыўшы ў значнай ступені прадукцыйнасьць фабрык і заводаў, спрыяючы далейшаму разгортваньню соцыялістычнай прамысловасьці. Але гэтыя мерапрыемствы, якія маюць буйнейшае палітычна-гаспадарчае значэньне, праводзіліся часта непадрыхтавана.

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

У працягу бягучага году на бесьперапынны рабочы тыдзень пераводзіцца 80 проц. прад-

прыемстваў і ў бліжэйшы год будуць пераведзены на бесьперапынку іншыя 20 проц.

Гаворачы аб рабоце прамысловасьці, нельга не закрануць пытаньняў матэрыяльнага становішча рабочых. Становішча рабочых зьяўляецца важнейшым фактарам пасьпяховага ходу работы фабрык і заводаў. Калі мы возьмем значны адрэзак часу—паўтара гады, то мы будзем мець, у параўнаньні з тым становішчам, якое было паўтара гады таму назад, даныя, якія сьведчаць аб паляпшэньні матэрыяльнага становішча рабочых, аб павялічэньні рэальнай заработнай платы, мы будзем мець магчымасьць адзначыць далейшае прасоўваньне ўперад. Калі-ж мы возьмем невялікі адрэзак часу—апошняе паўгодзьдзе—то тут на працягу гэтага паўгодзьдзя мы ня можам пахваліцца дасягненьнямі, бо ёсьць трывожныя даныя, якія сьведчаць аб тым, што рэальная зарплата рабочых за апошняе паўгодзьдзе зьнізілася. Праўда, усе лічбы і даныя, якія нам прадстаўлены ў гэтым пытаньні, маюць патрэбу ў пэўных папраўках. Бюджэтны індэкс раней

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

вылічаўся інача, чым ён вылічаецца зараз, таму даныя атрымліваюць ня зусім параўнальны, але прымаючы пад увагу адноснасьць гэтых лічбаў, мы можам сказаць, што номінальная зарплата рабочага ў грашовым выяўленьні за першае паўгодзьдзе 1929-30 г. у параўнаньні з першым паўгодзьдзем 1928-29 г. узрасла на 6,4 проц., а бюджэтны індэкс за гэты час павысіўся ў некалькі большых разьмерах—на 8—10 проц.

Яшчэ адным трывожным сыгналам зьяўляецца напружанае становішча, якое ствараецца ў нас у абсягу забесьпячэньня гораду мясам і тлушчамі. Напружанасьць забесьпячэньня мясам і тлушчамі прымушае рабочага купляць мяса і тлушчы на вольным рынку, гэтым самым павялічваючы бюджэтны індэкс і зьніжаючы рэальную зарплату рабочых.

Такім чынам, усе гэтыя даныя сыгналізуюць нам трывожнае становішча рабочага забесьпячэньня і высоўваюць проблему матэрыяльнага забесьпячэньня рабочых. Нашым організацыям трэба сур'ёзна паставіць гэта пытаньне, трэба павялічыць, павысіць загатоўку

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

адначасова з гэтым па магчымасьці больш поўна скарыстоўваючы рэсурсы, якія ў нас ёсьць (як, напрыклад, рыбныя, якія могуць замяніць мяса), найбольш экономна выдаткуючы наяўныя запасы продуктаў і найбольш поўна абслугоўваючы рабочае насельніцтва продуктамі, якія мы маем.

## На шляху соцыялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі.

Сельская гаспадарка разьвівалася за справаздачны пэрыод больш павольным тэмпам у параўнаньні з ростам прамысловасьці. Даныя апошніх год гавораць аб тым, што агуловая продукцыя ў сельскай гаспадарцы складае ў 1927-28 г. 4,2 проц., у 1928-29 г.— 4,7 проц. і ў цяперашнім годзе 6,7 проц. Гэтыя тэмпы ня ідуць ні ў якае параўнаньне з тымі быстрымі тэмпамі росту, якія мы бачым у прамысловасьці. Адставаньне тлумачыцца раздробленасьцю і адсталасьцю сельскай гаспадаркі. Толькі арганізацыяй буйной соцыялістычнай гаспадаркі, разгортваньнем саўгасаў і колгасаў, можна вывесьці сельскую гас-

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ



З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы